1. *Про* деякі питання розвитку Національного історико-культурного заповідника «Гетьманська столиця» та селища Батурин [Электронный ресурс] / Верховна рада України. – Режим доступа: https://zakon.rada.gov.ua/laws/show/1131/2007. – Дата доступа: 11.05.2019.

2. *Цитадель* Батуринской крепости [Электронный ресурс] // Национальный историко-культурный заповедник «Гетманская столица». – Режим доступа: http://www.baturin-capital.gov.ua/b-museum/90-b-citadel.html. – Дата доступа: 11.05.2019.

3. *Ленченко, В*. Відтворення Батуринського замку / В. Ленченко // Пам'ятки України: історія та культура. – 2008. – № 3. – С. 8-17.

4. *Позняк-Хоменко, Н*. Виктор Ющенко инициировал возвращение в Украину праха легендарного гетмана Ивана Мазепы [Электронный ресурс] / Н. Позняк-Хоменко // Украина молодая. – 18.10.2017. – № 124. – Режим доступа: https://www.umoloda.kiev.ua/number /3225/188/116811/. – Дата доступа: 11.05.2019.

5. *Mezentsev, V.* Pylyp Orlyk's coat of arms and other archaeological finds at Baturyn in 2017-2018 / V. Mezentsev // Ukrainian Echo. – 2019. – № 4. – С. 1-2.

6. *Музей* археологии Батурина [Электронный ресурс] // Национальный историко-культурный заповедник «Гетманская столица». – Режим доступа: http://www.baturin-capital.gov.ua/b-museum/22-museumofarchaeology.html. – Дата доступа: 11.05.2019.

7. *Дом-музей* генерального судьи В. Кочубея [Электронный ресурс] // Национальный историко-культурный заповедник «Гетманская столица». – Режим доступа: http://www.baturin-capital.gov.ua/b-museum/17-kochybeja.html. – Дата доступа: 11.05.2019.

8. *Цитадель* Батуринской крепости [Электронный ресурс] // Национальный историко-культурный заповедник «Гетманская столица». – Режим доступа: http://www.baturin-capital.gov.ua/b-museum/90-b-citadel.html. – Дата доступа: 11.05.2019.

9. *Дворец* Кирилла Разумовского [Электронный ресурс] // Национальный историко-культурный заповедник «Гетманская столица». – Режим доступа: http://www.baturin-capital.gov.ua/b-museum/19-rozumovskij.html. – Дата доступа: 11.05.2019.

10. *Україна* гетьманська в образах сучасних українських художників (фотоальбом-каталог). – Чернігів, 2011. – 52 с. : 51 іл.

11. *Батуринфест* «Шабля» відгудів! [Электронный ресурс] // Батуринська об'єднана територіальна громада. – Режим доступа: https://baturyn-rada.gov.ua/news/1530696064/. – Дата доступа: 11.05.2019.

***Ушылава Таццяна Вячаславаўна***

## Музей-сядзіба Ф. Багушэвіча як прыклад захавання пісьменніцкай сядзібы XIX ст.

Артыкул прысвечаны гісторыі станаўлення філіяла Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры «Музея-сядзібы Францішка Багушэвіча "Кушляны"». Сядзібна-паркавы комплекс з'яўляецца ўнікальным для Беларусі прыкладам захаванай сядзібы пісьменніка XIX стагоддзя. З 1951 г. і да стварэння музея (1988 г.) у сядзібе працавала Кушлянская сельская бібліятэка, што паспрыяла захаванасці помніка і асабістых рэчаў пісьменніка.

*Ключавыя словы:* музей-сядзіба пісьменніка; літаратурна-мемарыяльны музей; бібліятэка; захаванне гісторыка-культурнай спадчыны; гісторыка-літаратурная крыніца; мемарыялізацыя; музейны прадмет.

***Tatiana V. Ushylava***

## Museum Estate of F. Bagushevich there is an Example Preservation of the Writer's Estate of the XIX Century

The article describes history of the formation of a branch of the State Museum of History of Belarusian Literature «Museum estate of Frantishek Bagushevich "Kushlyany"». The estate



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

and park complex is a unique example for Belarus preserved estate of the writer of the XIX century. Since 1951 and prior to the establishment of the museum (1988), in the estate was village's library, which has contributed to the preservation of the monument and the personal things of the writer.

*Keywords:* museum estate of the writer; literary and memorial museum; library; protection of historical and cultural heritage; historical and literary sources; memorialization; museum object.

Літаратурныя месцы Беларусі – аб'ект паломніцтва шматлікіх прыхільнікаў таленту вядомых паэтаў і пісьменнікаў. Не сакрэт, што многія прыдуманыя краіны і літаратурныя героі маюць цалкам рэальныя прататыпы. Убачаныя ў дзяцінстве і юнацтве краявіды, людзі і падзеі часам натхняюць пісьменнікаў настолькі, што яны проста не могуць не расказаць пра гэта ў сваіх кнігах. Сёння жыхары і госці Беларусі могуць выправіцца ў вандроўкі па шматлікіх літаратурных мясцінах: музей на радзіме Янкі Купалы ў Вязынцы, музей на радзіме Якуба Коласа ў Акінчыцах, музей Кузьмы Чорнага ў Цімкавічах, Музей-хата Петруся Броўкі ў Пуцілкавічах і г. д. Але сядзіб пісьменнікаў, якія жылі і займаліся літаратурнай творчасцю ў XIX ст., не засталося за выключэннем адной. Філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры «Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча "Кушляны"» – гэта яскравы прыклад адзінай добразахаванай сядзібы пісьменніка XIX ст.

Сядзіба Францішка Багушэвіча размешчана на паўднёва-заходняй ускраіне вёскі Кушляны Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Гісторыя сядзібы ўзыходзіць да XVIII ст., калі ў 1749 г. за 450 злотых маёнтак набыў А. Багушэвіч (прапрадзед паэта) [1, с. 6]. Францішак Багушэвіч, як вядома, нарадзіўся ў фальварку Свіраны недалёка ад Вільні. У перыяд 1841–1846 гг. сям'я перабралася ў спадчынны маёнтак і свядомыя гады жыцця пісьменніка прайшлі ў Кушлянах. Пасля паўстання 1863–1864 гг. Ф.Багушэвіч, ратуючыся ад рэпрэсій, выехаў з тэррыторыі Беларусі амаль на 20 гадоў. Толькі ў 1884 г. пісьменнік вяртаецца ў Вільню, а ў 1896 г. становіцца паўнапраўным гаспадаром сядзібы, будуе новы дом побач са старым бацькоўскім. У маі 1898 г. творца, будучы ўжо цяжка хворым, перабраўся туды на сталае жыццё, дзе ў 1900 г. памёр. Да 1940-х гг. нашчадкі паэта жылі ў спадчынным маёнтку [2, с. 2]. Пасля Багушэвічаў сядзіба здавалася ў арэнду да 1951 г.

Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча з'яўляецца класічным прыкладам літаратурна-мемарыяльнага музея не толькі таму, што там прайшлі дзяцінства, юнацтва і апошнія гады жыцця пісьменніка, але і таму, што менавіта там творца карпатліва працаваў над складаннем слоўніка беларускай мовы, там падрыхтаваў зборнік «Беларускія апавяданні Мацея Бурачка» і трэці зборнік вершаў «Скрыпачка беларуская» (лёс твораў дагэтуль невядомы) [1, с. 29]. У адрозненне ад іншых літаратурна-мемарыяльных музеяў будынкі музея-сядзібы Ф. Багушэвіча XIX ст. добра захаваліся.

Сёння комплекс у Кушлянах уключае сядзібны дом, альтанку (капліцу), гаспадарчыя пабудовы і парк. Сядзібны дом – прамавугольная ў плане 1-павярховая зрубная пабудова пад высокім 2-схільным дахам [3, с. 257]. Па фронце галоўнага фасада адкрытая слупавая галерэя-навес з дашчатым парапетам. Планіроўка дома анфіладная, уваходы з боку галоўнага і бакавога фасадаў.

З малых архітэктурных форм засталася драўляная альтанка – цэнтрычнае ў плане збудаванне каркаснай канструкцыі з шатровым дахам-навесам. Мясцовая назва альтанкі «Народная воля». Паводле падання, першапачатковая альтанка была зроблена рукамі Францішка Багушэвіча і яго сяброў у памяць ахвяр нацыянальна-вызваленчага паўстання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1863–1864 гг. Не ацалела драўляная скульптура «Укрыжаванне», якая да 1939 года знаходзілася ў капліцы.

Добра захавалася гаспадарчая каменная пабудова (адрына), якая знаходзіцца на паўднёвым захадзе ад сядзібнага дома. Аналізуючы стан захаванасці сядзібна-паркавай архітэктуры XIX стагоддзя, можна выявіць, што вялікую колькасць помнікаў, якія ацалелі, складаюць гаспадарчыя пабудовы. Таму неабходна падкрэсліць важнасць кушлянскай адрыны: Ф. Багушэвіч рабіў яе мураванай з мэтай паказаць сваім суседзям, што на пабудову такога тыпу не варта марнаваць дрэва, трэба берагчы прыродныя рэсурсы. Гэты момант падкрэслівае прагрэсіўнасць поглядаў Ф. Багушэвіча не толькі на творчасць, але і на паўсядзённыя пытанні. Сёння ў каменнай адрыне месціцца выстава прылад працы і прадметаў побыту беларускага сялянства канца XIX ст. – пачатку XX ст.

Да нашых дзён дайшла адкрытая азелянёная пляцоўка, якую ўтвараюць парк з садам, расчлянёным сеткай алей. Па ўспамінах сучаснікаў Багушэвіча, перад паэтавым домам некалі рос вялікі сад, які працягваўся да поплава. Сёння сярод насаджэнняў пераважаюць ліпа, клён, елка. Праз каштанавую прысаду наведвальнікі могуць трапіць да каменя памяці Францішка Багушэвіча.

Калі не стала пісьменніка, то блізкія і сябры ініцыявалі выбіццё на валуне надпісу «Pamięći Macieja Buraczka». Сам творца любіў прыходзіць у гэтае месца і, па ўспамінах сучаснікаў, пісаць там вершы і хаваць у адмысловыя схованкі пад камень [2, с. 30]. Валун стаў сапраўдным месцам паломніцтва ў Кушлянах. Да знакавых месцаў на тэрыторыі сядзібы можам аднесці і Лысую гару – узвышша, дзе сям'я Багушэвічаў любіла бавіць час, праводзіць святы.

У пасляваенным перыядычным друку можам сустрэць артыкулы, у якіх уздымаецца пытанне пра далейшы лёс сядзібы пісьменніка. Так, у газеце «Літаратура і мастацтва» за 1948 г. адзначаецца, што яшчэ ў 1946 г. у доме былі рэчы, якія калісці належалі паэту [4, с. 4]. Адзначаецца, што там былі таксама мэбля, рэшткі бібліятэкі, рукапісы, партрэты і фатаграфічныя карткі сям'і Багушэвіча. Але на момант напісання артыкула ўсё гэта ўжо знікла. Акрамя гэтага, аўтар артыкула адзначае, што гонтавы дах дома згніў, аброс мохам, а замест былога ганку застаўся адзін спарахнелы слупок. У артыкуле Віталя Вольскага для газеты «Літаратура і мастацтва» за 1950 г. таксама ўзгадваецца пра велізарную бібліятэку Багушэвіча, ад якой амаль нічога не засталося [5, с. 4]. У згаданых артыкулах адзначаецца вялікая неабходнасць захаваць гісторыка-культурную каштоўнасць і стварыць там музей з бібліятэкай.

Добры стан сядзібна-паркавага комплексу з 1951 г. і да моманту стварэння музея – справа захавальніка і вартаўніка сядзібы, прыхільніка творчасці Францішка Багушэвіча Міхаіла Сямёнавіча Ляпехі. У 1948 г. у Кушлянах з'явіўся першы калгас. Адрыну і гумно прыстасавалі пад ферму. Першапачаткова М. С. Ляпеха працаваў загадчыкам на ферме, а потым стаў вартаўніком сядзібы. У 1951 г. у доме быў зроблены рамонт, пакрыты бляхай дах, веранда стала зашклёнай і быў зроблены ўваход па цэнтры хаты. У доме быў арганізаваны клуб і Кушлянская сельская бібліятэка імя Ф.Багушэвіча. Паводле А. П. Жамойціна, намаганнямі М. С. Ляпехі ў сядзібу былі вернуты крэслы, фартэпіяна і іншыя рэчы.

З архіва даследчыка У. І. Содаля ў музей трапіў сшытак з водгукамі наведвальнікаў, якія пабывалі ў Кушлянскай сельскай бібліятэцы з 26 мая 1970 г. па 23 красавіка 1971 г. Аналіз крыніцы дазваляе сцвярджаць, што ў дадзены перыяд сядзібу пераважна наведвалі школьнікі і служачыя з розных гарадоў і вёсак Беларусі (Валожын, Крэва, Гальшаны, Мінск; Ашмянскі, Смаргонскі, Ганцавіцкі, Маладзечанскі, Лідскі, Мастоўскі раёны). Цікавымі запісамі з'яўляюцца водгукі членаў фальклорнай навуковай экспедыцыі Акадэміі Навук БССР ад імя Арсеня Ліса і ад наведвальнікаў з Польшчы. Пераважная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

большасць запісаў уключае ў сябе пажаданне, каб у сценах сядзібы быў створаны музей Ф. Багушэвіча. Адметнасць некаторых водгукаў у тым, што наведвальнікі дзякуюць за экскурсію па «дому-музею». Гэтае ўражанне знаходжанння менавіта ў музеі ствараў незвычайны захавальнік.

Акрамя функцый вартаўніка, М. С. Ляпеха выконваў і функцыі экскурсавода: ведаў шмат вершаў Ф. Багушэвіча, дэкламаваў іх на памяць, праводзіў экскурсіі. Сучаснікі ўзгадваюць, што захавальнік сядзібы валодаў грунтоўнымі ведамі пра Ф. Багушэвіча. Нягледзячы на ўзрост і побытавыя праблемы, М. С. Ляпеха пражыў у хаце Ф. Багушэвіча да 1988 г. Дзякуючы яму сядзіба, якая не мела статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці, дайшла да нашага часу.

Важным этапам у пераўтварэнні бібліятэкі ў доме пісьменніка ў музей стала дзейнасць Анатоля Анатольевіча Янца, які ўзначальваў калгас у Кушлянах з 1980 па 1987 гг. Паводле А. П. Жамойціна, агульнымі намаганнямі калгаса, улад Смаргонскага раёна і творчай інтэлегенцыі ў Кушлянах у 1983 г. было арганізавана літаратурнае свята. У той год удзячныя кушлянцы пасадзілі каля каменя памяці паэта-земляка 60 саджанцаў дуба (па колькасці пражытых пісьменнікам гадоў). Сіламі мясцовых майстроў на ўзор старой была адбудаваная новая альтанка. Дзякуючы намаганням А. А. Янца была складзена дакументацыя на рэстаўрацыйныя работы па сядзібе Ф. Багушэвіча. У выніку ўсіх намаганняў Пастановай Савета Міністраў БССР ад 18.02.1988 № 32 сядзіба Ф. Багушэвіча была вызначана як помнік гісторыі і пачаліся рэстаўрацыйныя работы па яе аднаўленні. З 1988 г. і па дадзены момант загадчыкам філіяла і захавальнікам спадчыны пісьменніка з'яўляецца Алесь Пятровіч Жамойцін.

Да 150-годдзя з дня нараджэння паэта ў 1990 г. быў рэалізаваны праект рэстаўрацыі сядзібы, які быў распрацаваны навукова-вытворчымі майстэрнямі «Белрэстаўрацыя». Аўтар праекта – В. Слюнчанка, на заключным этапе рэстаўрацыю працягвала Я. Ханіна. У будынку сядзібы былі адноўлены падмурак, франтоны, дах і першапачатковая планіроўка дома, перароблена галерэя-навес. На тэрыторыі таксама былі адноўлены адрына і студні.

У доме пісьменніка намаганнямі калектыву Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры створана літаратурна-дакументальная экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці Ф. Багушэвіча. Навуковую канцэпцыю музея распрацавалі Н. Цвірка і І. Марачкіна. Мастацкае афармленне ажыццявіў Г. Чысты. Для наведвальнікаў Музей адкрыўся 2 чэрвеня 1990 г. У доме былі адноўлены два мемарыяльныя пакоі – гасцёўня і кабінет. Літаратурная экспазіцыя месціцца ў трох залах і адлюстроўвае жыццёвы і творчы шлях паэта. У экспазіцыі размешчаны мемарыяльныя рэчы, матэрыялы і дакументы па гісторыі XIX ст., выданні твораў паэта.

Наступным этапам у гісторыі музея стала наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці сядзібнаму комплексу «Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча "Кушляны"» з прысваеннем III катэгорыі каштоўнасці згодна з рашэннем Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычный рады пы пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны (пратакол №111 ад 28.07.2005 г.).

Сёння філіял «Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча "Кушляны"» з'яўляецца адным з любімых месцаў аматараў беларускай літаратуры і гісторыі. Музей уключаны ў шэраг турыстычных маршрутаў. Наведвальнікі могуць апынуцца ў атмасферы XIX ст. і прайсці шляхамі Ф. Багушэвіча дзякуючы захаванаму сядзібна-паркаваму комплексу, экспазіцыі і асабістым рэчам пісьменніка і яго сям'і (частка з іх знойдзена падчас раскопак на месцы былой бацькоўскай сядзібы Багушэвічаў). Праблемным полем да нашага часу застаецца немагчымасць даследвання страчанай часткі архіва пісьменніка, яго бібліятэкі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рукапіснай спадчыны. На жаль, прыжыццёвыя выданні пісьменніка таксама пакуль не прадстаўлены ў экспазіцыі.

Родныя мясціны пісьменніка, уцалелыя будынкі з усёй прылеглай тэрыторыяй, самі краявіды, дарогі, з якімі было звязана яго жыццё, маюць вялікае значэнне для вывучэння і асэнсавання творчасці пісьменніка, узнаўлення яго біяграфіі. На дадзены момант філіял «Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча "Кушляны"», акрамя функцый музея, з'яўляецца ўнікальнай гісторыка-літаратурнай крыніцай. Крыніцай, якая захавалася дзякуючы неабыякавым да нашай гісторыка-культурнай спадчыны людзям: ад захавальніка бібліятэкі і старшыні калгаса да простага наведвальніка, які пакінуў на паперы сваё жаданне ўбачыць у Кушлянах музей, прысвечаны выбітнаму беларускаму пісьменніку.


1. *Багушэвіч, Ф.* Выбраныя творы / Францішак Багушэвіч ; уклад. з тэксталагіч. падрыхт., прадм. і камент. Язэпа Янушкевіча. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – С. 6-29.
2. *Содаль, У.* Кушлянскі кут / У. Содаль. – Мінск : Полымя, 1990. – С. 2-30.
3. *Архітэктура* Беларусі : энцыклап. даведнік / рэдкал. : А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 257.
4. *Недаравальная* безуважнасць да памяці паэта // Літаратура і мастацтва. – 1948. – 21 жн. – С. 4.
5. *Вольскі, В.* На радзіме паэта / В. Вольскі // Літаратура і мастацтва. – 1950. – 13 мая. – С. 4.



***Штолько Марина Анатольевна***


## Книжная коллекция А. И. Белецкого как фрагмент мозаики историко-культурной памяти


Описано содержание книжной коллекции Александра Ивановича Белецкого, переданной библиотеке Института литературы им. Т. Г. Шевченко НАН Украины наследниками ученого. Показано, что коллекция А. И. Белецкого надлежащим образом репрезентирует историко-культурную жизнь конца XIX–XX вв. на Украине.



*Ключевые слова*: А. И. Белецкий; книжная коллекция; фонд редкой книги; Институт литературы им. Т. Г. Шевченко НАН Украины.



***Marina A. Shtolko***


## Book Collection A. I. Beletsky as a Mosaic Fragment of Historical and Cultural Memory


The described by content of the book collection of Alexander Ivanovich Beletsky. The personal book collection was handed over to the National Academy of Sciences of Ukraine Shevchenko Institute of Literature by the heirs of the scientist. It is shown that the collection of A. I. Beletsky properly represents the historical and cultural life of the late nineteenth and twentieth centuries in Ukraine.



*Keywords*: A. I. Beletsky; personal book collection; rare book collection; National Academy of Sciences of Ukraine Shevchenko Institute of Literature.


В последнее время книжные коллекции и личные фонды деятелей науки и культуры, которые хранятся в библиотеках и архивах Украины, привлекают все большее внимание исследователей. Этой тематике посвящается значительное количество публикаций в специализированных изданиях. Личная библиотека ученого рассматривается как элемент культуры эпохи, в которой он работал. Личные книжные коллекции рассказывают о круге научных интересов ученого.

А. И. Белецкий (1884–1961) был филологом широкого профиля, много и успешно работал в сфере теории литературы, литературоведения, изучения украинского театра, в

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ